# РЭЛІГІЙНАСЦЬ ВУЧНЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ САВЕЦКІХ ШКОЛ У 1920–1930-я гг. [1]

**Пушкін Ігар Аляксандравіч**
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін
УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання";
кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Магілёў, Беларусь)

У міжваенны час рэлігійныя настроі ў БССР былі найбольш моцныя ў месцах кампактнага пражывання прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Сярод польскага і літоўскага насельніцтва адзначаўся моцны ўплыў рымска-каталіцкага касцёла, прычым літоўцы ў БССР імкнуліся да таго, каб на чале прыходаў знаходзіліся ксяндзы літоўскай нацыянальнасці. У асяроддзі латышскага і нямецкага насельніцтва рэспублікі значны ўплыў мела лютэранства і англіканская царква, сярод рускіх – стараверства і сектанства.

Згодна рашэння сакратарыята ЦК УЛКСМ у 1929 г. былі абследаваны 29 польскіх савецкіх школ у СССР для падрыхтоўкі фактычнага матэрыялу ў даклад "Работа камсамола па саветызацыі польскіх працоўных школ". Сярод іх было 12 школ (з іх 7 сямігодак) з БССР: Мінская 6-я (235 вучняў), Мінская 33-я (513 вучняў), Мастычанская (37 вучняў), Амнішэўская (73 вучняў), Койданаўская (175 вучняў) з Мінскай акругі, Сарочынскай (29 вучняў) з Полацкай акругі, Віцебская (332 вучняў) з Віцебскай акругі, Магілёўская (279 вучняў), Шклоўская (50 вучняў) з Магілёўскай акругі, Бабруйская (143 вучняў), Барысаўская (85 вучняў) і Хойнікская (165 вучняў) Гомельскай акругі з агульнай колькасцю вучняў – 2116 (з іх 6 членаў КСМ і 454 піянера). У школах працавалі амаль 100 настаўнікаў [1, арк. 51–78].

Гэты матэрыял дазваляе прасачыць тагачасны светапогляд часткі дзяцей польскай нацыянальнасці, які, у пэўнай ступені, фарміраваўся пад уплывам бацькоў і сям'і, асабліва ў адносінах да рэлігіі. Улады на той час адзначалі наяўнасць моцнага ўплыву каталіцкай рэлігіі на вучняў польскіх школ. Найбольшая наведваемасць касцёла вучнямі школ была ў Койданаўскай школе – 54%, Віцебскай – 44%, Мінскай 6-й каля 40%, шмат было такіх, якія адказвалі "рэдка ходзім у касцёл таму, што ён далёка" [1, арк. 68].

Вучні польскіх школ не толькі наведвалі касцёл, але і ўваходзілі ў рэлігійныя гурткі (напрыклад, Мінская 6-я, Віцебская школы). У Шклоўскай школе вучні малодшых класаў практычна ўсе верылі ў Бога, 2 вучаніцы пелі ў касцёльным хоры. Вучні 3 і 4 класаў у касцёл не хадзілі, за выключэннем 4 чалавек (усяго ў класах па 25 вучняў), 2 пелі ў касцёльным хоры [2, арк. 39].

Цікавую інфармацыю дае сацыяльны склад веруючых вучняў польскай нацыянальнасці: дзеці рабочых – 45%, беднякоў – 40%, сераднякоў – 26%, служачых – 62%, беспрацоўных – 75%. Гэтай статыстыцы можна давяраць,

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання задання "Рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей ў перыяд станаўлення і развіцця БССР (1920–1930-я гг.)" ДПНД "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава" у падпраграме "Гісторыя, матэрыяльная і духоўная культура беларускага народа".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нават з улікам таго, што яна ў той час у пэўнай ступені карэктавалася ўладамі з улікам прынятай ўстаноўцы па рэлігійнасці насельніцтва.

У Койданаўскай школе касцёл наведвалі 96 вучняў, з іх 31 хадзілі да споведзі. Сярод іх адзначалася свядомае нежаданне слухаць антырэлігійныя размовы. Калі іх прымушалі хадзіць на антырэлігійныя мерапрыемствы дык казалі: “аднім вухам слухай, а другім выпускай”. Харавы гурток пры касцёле наведвалі 10 вучняў школы. Вучні з задавальненнем наведвалі бібліятэку, якая існавала ў ксяндза мясцовага касцёла. 5 вучняў Барысаўскай школы хадзілі ў касцёл. Мінская 6-я школа – у малодшых класах каля 15% дзяцей падтрымлівалі рэлігійныя пастулаты. Прымалі ўдзел ў рэлігійных працэсіях, да споведзі хадзілі каля 20% вучняў школы. Двое вучняў удзельнічалі ў збораў сродкаў на аднаўленне алтара ў касцёле. Былі выпадкі, калі вучні школы затыкалі вушы, каб не чуць, пры правядзенні антырэлігійных бясед. Гучалі выказванні: “Будем лучше учиться, чем зря тратить время на беседы о религии”, “большевики тоже понаделали икон” (партэры правадыроў), “религия ничего плохого человеку не даёт”. Уплывам бацькоў на дзяцей улады тлумачылі наведванне 15 вучнямі (з іх 5 піянераў) касцёла падчас “Пасхі” [1, арк. 72].

У Магілёўскай школе была заўважана тэндэнцыя – чым старэйшыя вучні, тым меньш веруючых. Так у 5 групе было 12 веруючых, у 6-й – 6 чалавек, у 7-й – 4. Пад час свята “Божага нараджэння” на ўроках адсутнічала (24 снежня): 5 клас – 3 вучня; 25 снежня – 3; адпаведна 6 клас: 1 і 2 вучня; падчас свята “Пасхі” (Вялікая ноч, 31 сакавіка) у 5 класе адсутнічалі 9 вучняў, 6 клас – 4 вучня, 7 клас – 1 [2, арк. 36].

У Мастычанскай польскай школе Мінскай акругі ў дзень Ражства Хрыстова ў школу з’явілася ўсяго 3 вучні (з 37), на “Пасху” – 4 вучні. У Мінскай 33-й школе некатарыя вучні ўпарта пісалі слова “Бог” з вялікай літары. У вершах антырэлігійнага зместу для школьнай сцен-газеты слова “ксёндз” мянялі на слова “поп”. Шмат вучняў былі членамі касцёльных гурткоў, якія агітавалі іншых вучняў каб тыя таксама ўступалі ў іх гурткі, паведамлялі бацькам тых вучняў, якія ўступалі ў піянеры. Пры правядзенні ананімнага анкетавання было выяўлена (сярод старэйшых груп вучняў): веруючыя складалі – 24,8%, хісталіся ў веры – 17,4%, не верылі ў Бога – 57,8%. У групе веруючых 11,4% складалі актыў з членаў гуртка “ружанца” і іншых рэлігійных гурткоў. У школе нелегальна існавала скаўцкая арганізацыя [1, арк. 73, 75].

У БССР дзейнічалі 10 нацыянальных літоўскіх школ. Спробы ўладаў заслаць у вёскі, дзе жылі літоўцы, настаўнікамі літоўскіх школ членаў КП(б)Б для правядзення саветызацыі і антырэлігійнай працы да канца 1920-х гг. былі безвыніковымі [7, арк. 4]. Вынікам варожай рэлігійнай дзейнасці лічыліся партыйнымі органамі выказванні вучняў у Латрошчанскай латышскай нацыянальнай школе, пры правядзенні размовы аб Леніне: “*Ленін мне нічога не даў*”, “*Если бы у меня был портрет Ленина, я бы его сжег*”, “*Раньше были буржуи, теперь есть новые, ничего не делающие, а получающие жалование*” і г.д. [5, с. 116–117; 6, с. 135–145].

Нягледзячы на дзейнасць партыйных і савецкіх актывістаў (камсамола, ізбачоў, настаўнікаў і г.д.), асноўная частка нацыянальных меншасцей БССР



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

захоўвала веру і падтрымлівала духавенства. У латышскіх, літоўскіх, нямецкіх, польскіх і яўрэйскіх сем'ях працягвалі маліцца на роднай мове, чытаць рэлігійныя кнігі. У Клімавіцкім раёне рабін Брыскер арганізаваў 2 хедэры, адзін на прыватнай кватэры, другі пры сінагозе пад кіраўніцтвам рабіна Локшына. У красавіку 1935 г. хедэр наведвалі, у тым ліку, і 10 дзяцей яўрэйскай савецкай школы [3, арк. 99].

Вялікі ўплыў рэліі на дзяцей быў у сем'ях стараабрадцаў (рускіх). У Пліскім сельсавеце Бешанковіцкага раёну пад час перапісу 1937 г. іх дзеці заяўлялі, што яны ўсе веруючыя. У Кіраўскім раёне ў в. Капусціна нават піянеры дзеці старабрадцаў насілі крыжыкі і не хавалі сваю рэлігійнасць [4, арк. 45]. Вучні з сямей стараабрадцаў хрысціліся перад і пасля абеду ў школьнай сталоўцы, адмаўляліся слухаць антырэлігійную інфармацыю. Напрыклад, у Мінкаўскай і Пархінскай рускіх школах Рагачоўскага раёна [3, арк. 94, 95, 97].

Даследаванне рэлігійнасці вучняў нацыянальных савецкіх школ у БССР паказала захаванне веры ў значнай колькасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Палякі, літоўцы, латышы, немцы, яўрэі, руския разнастайнымі сродкамі імкнуліся захаваць ролю рэлігіі ў сваім духоўным жыцці. Цалкам ліквідаваць рэлігійныя перакананні ў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей партыйна-савецкаму кіраўніцтву не ўдалося, нягледзячы на сфабрыкаваны крымінальны пераслед служыцелей культаў і рэлігійнага актыву, знішчэнне культавых будынкаў і прапаганду сацыяльна-эканамічных і культурных дасягненняў у СССР.

**Літаратура**

1. Вынікі выбарачнага абследавання польскіх працоўных школ, 1929 год // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМагВ). – Фонд. 6577. Воп. 1. Спр. 863.
2. Вынікі абследавання Шклоўскай польскай школы // ДАГАМаг. – Фонд 6577. Воп. 1. Спр. 863.
3. Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 11852.
4. Докладная записка «О состоянии антирелигиозной пропаганды в КП(б)Б и активизации церковников и сектантов в ряде районов Белоруссии (по данным 40 районов)» от 07.06.1937 г. // НАРБ. – Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 12109.
5. Пушкін, І. Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.): манаграфія / І. Пушкін / навук. рэд. М.П. Касцюк. – Магілёў: МДУ імя А.Куляшова, 2004. – 168 с.
6. Пушкін, І.А. Удзел латышоў у грамадска-палітычным і культурным жыцці Магілёўшчыны (20-я гады) / І.А. Пушкін // Гісторыя беларускага Падняпроўя: навуковая канферэнцыя. – Магілёў: Абласная друкарня, 1999. – С. 135–145.
7. Спіс Літоўскіх школ і характарыстыка працуючых у іх школьных работнікаў // НАРБ. – Фонд 4п. Воп. 1. Спр. 4191.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова